і паводзіны герой асуджае блізкіх на пакуты і тым самым сам замыкаецца ва ўласнай адзіноце, выкліканай стратай любімых людзей, у жыцці якіх быў заключаны сэнс яго існавання, а таксама па прычыне адчування сваёй віны перад імі.

Матыў смерці і хваробы адлюстроўваецца ў пераважнай большасці аповедаў Ф. Сіўко, якія прама ці ўскосна ўплываюць на існаванне кожнага з герояў твораў, выклікаючы вострае і непараможнае адчуванне адзіноты. Знаходзячыся ў свеце сацыяльным, яны не здольныя напоўніцу далучыцца да яго па прычыне комплексу віны, расчаравання або адчужанасці.

**Спіс літаратуры**

1 Сіўко, Ф. Асіметрыя : аповеды, эсэ, запісы / Ф. Сіўко. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2005. – 224 с.

УДК 821.161.3`06-14:141.32

А. В. АНЦІМОНІК
(г. Гомель, універсітэт імя Ф. Скарыны)

## ЭКЗІСТЭНЦЫЙНЫ КАНФЛІКТ У ЛІРЫЧНЫХ ТЭКСТАХ СУЧАСНЫХ МАЛАДЫХ БЕЛАРУСКІХ ПАЭТАЎ

У артыкуле на прыкладзе творчасці В. Трэнас, В. Рыжкова, А. Рудака, К. Анохіна засяроджваецца ўвага на экзістэнцыйных рэфлексіях у творчасці маладых беларускіх паэтаў, акрэсліваюцца прычыны і сродкі выражэння экзістэнцыйнага канфлікту ў лірычных тэкстах, а таксама асэнсоўваецца важкасць асноўных “быційных” пытанняў для сучаснаснай літаратуры.

Сённяшняя беларуская лірыка, у якой асабліва моцнымі з’яўляюцца асобасны пачатак, трагічнае светаадчуванне і імкненне да інтэлектуалізацыі, даволі часта звяртаецца да праблем чалавечага быцця, філасофскага пошуку адказаў на адвечныя пытанні і, такім чынам, да экзістэнцыйных матываў. Паняццем “экзістэнцыйны” (вытворнае ад слова “экзістэнцыя”) выражаецца ўсё тое, што звязана з духоўным вопытам чалавека, з тымі гранічнымі пытаннямі, вырашыць якія альбо цяжка, альбо нават немагчыма на дадзены момант, таму што яны звязаны з пошукамі вечнага сэнсу і існуюць на мяжы свядомага і бессвядомага. Ж. П. Сартр у працы “Экзістэнцыялізм – гэта гуманізм” тлумачыў: “Пад экзістэнцыялізмам мы разумеем такое вучэнне, якое робіць магчымым чалавечае жыццё і якое, акрамя таго, сцвярджае, што ўсякая ісціна і ўсякае дзеянне прадугледжваюць некаторае асяроддзе і чалавечую суб’ектыўнасць” [1]. З пункту гледжання дадзенай філасофіі, экзістэнцыяльнае мысленне – гэта існаснае пазнанне, у якім чалавек паўстае як цэласнасць, а яго цялесныя, эмацыйныя і духоўныя сілы знаходзяцца ў адзінстве (у якасці экзістэнцыі, існавання). Сама ж асоба не аддзяляе сябе ад асноў быцця, з чаго вынікае, што экзістэнцыя знаходзіцца ў непарыўнай сувязі з быццём.

Мысленне ў межах экзістэнцыялізму найбольш яскрава раскрылася, зразумела, у творчасці так званых філосафаў-экзістэнцыялістаў (даволі ўмоўнае паняцце, таму што да гэткіх дакладна адносіў сябе толькі Ж. П. Сартр). Менавіта яны сталі стваральнікамі новага бачання твора мастацтва і інтэнцый яго зместу, бо экзістэнцыялізм з’яўляецца, бадай, самым адчувальным у плане рэакцыі на змены ў грамадстве і свеце ўвогуле. Аднак “мастацкі твор або самога аўтара з пэўнасцю назваць «экзістэнцыялісцкімі» будзе няправільна” [2, с. 202], пра што разважае даследчыца С. Калядка. Таму і выключна экзістэнцыйных твораў у літаратуры вельмі мала.

Што тычыцца беларускага прыгожага пісьменства, то праявы разглядаемага “быцій-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

нага” мыслення на сённяшні дзень больш заўважны ў прозе, чым у паэзіі. Як сцвярджае С. Калядка, варта гаварыць не пра экзістэнцыяльную прыроду творчасці аўтараў, а пра экзістэнцыяльны ўхіл у іх рэфлексіях [2, с. 203]. Акрамя таго, даследчыца заўважае: “Калі ўлічыць, што інтэлектуалізм – неад’емная характарыстыка сучаснай беларускай паэзіі, то і праявы экзістэнцыялізму ў ёй не трэба вышукваць праз мікраскоп” [2, с. 204]. Таму што чалавек (паэт  у дадзеным кантэксце), які здольны самастойна разважаць, рана ці позна пачынае думаць аб сэнсе жыцця, аб цяжкавырашальных пытаннях, аб жыцці і смерці, аб каханні і страху, аб свабодзе і адказнасці, аб душы ўвогуле, але ён не імкнецца да адназначнасці ў вырашэнні гэтых праблем, то бок тут не апошнюю ролю адыгрывае ўплыў постмадэрнісцкай канцэпцыі “адназначнай ісціны не існуе”. Да прыкладу, у маладога творцы Кірылы Анохіна інтэрпрэтацыю дадзенай думкі можна ўбачыць у вершы “падчас сеансу пытанняў…”:

падчас сеансу пытанняў
лёгкія лунаюць вакол нас
цяжкія падаюць мне ў лоб
а тыя
на якія я не магу адказаць
віснуць у паветры
ўтвараючы пятлю
прызначаную
для маўчання [3].

Яшчэ адно пацверджанне канфлікту экзістэнцыі, толькі ўжо ў межах тэмы творчасці, – радкі паэткі Вікі Трэнас з лірычнага твора “Я карыстаюся сляпымі й куцымі словамі…”:

Сплываюць крывёю, набываючы новыя формы
мае вершы – магілкі выкшталцоныя [4, с. 55].

Сучасная маладая беларуская паэзія эстэтызуе экзістэнцыйныя праблемы і нібыта спагадліва дазваляе ім існаваць. Асноватворчасць сённяшняга сярэднестатыстычнага паэта базуецца на “трох кітах” – на болю, адзіноце і трагічным светаўспрыняцці. Апошняе паняцце можа ўключаць у сябе такія рысы, як адчуванне бессэнсоўнасці жыцця, пустэчы, дысгармонія паміж светам і душой. Нярэдка адным з самых яскравых жаданняў лірычнага героя з’яўляецца жаданне збегчы, схавацца ад свету, які яго акаляе. У той жа В. Трэнас падобныя эскапічныя матывы знаходзім: “Я бы ў пустэльні, бы ў пустэчы, бы ўва сне” [4, с. 19]. У Антона Рудака ў вершы “Жнівень” чытаем:

забыцьцё
нязьведанасьць
сьмерць
верасень
восень [5].

Разгубленасць перад светам – вельмі актуальная характарыстыка сучаснасці. Лічыцца, што менавіта сацыяльныя падзеі-зломы актывізуюць пытанні быцця, а драмы эпохі пераносяцца не толькі на асобу, але і на ўсю нацыю. І каму ж, як не паэту, першаму рэагаваць на ўсе складанасці і трагедыі. Варта зазначыць, што беларуская літаратура ўжо ў пачатку ХХ стагоддзя (калі сам экзістэнцыялізм яшчэ не да канца аформіўся як філасофская плынь) даволі якасна распрацавала матывы безвыходнасці і бессэнсоўнасці. Яскравым прыкладам можа служыць творчасць таго ж Я. Купалы ці М. Багдановіча. Трагічны пафас паэзіі не толькі адлюстроўваў светапогляды творцаў, але і з’яўляўся істотнай рысай працэсу развіцця тагачаснай айчыннай літаратуры. Будучы прадуктам чарговай пераломнай эпохі з яе спе-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

цыфічным светаадчуваннем “памежнага” чалавека, сучасная паэзія Беларусі – тое люстэрка, у якім адбіваюцца розныя пункты гледжання наконт дзейснага і метафізічнага быцця, грамадскага і асабістага жыцця, фізічнай і духоўнай смерці, etc.

Часта экзістэнцыйныя праблемы выражаюцца ў паэтычным творы праз унутраны канфлікт лірычнага суб’екта, што выбіваецца сваім постмадэрнісцкім гучаннем і подыхам адзіноты ледзь не сусветных масштабаў. Так, у вышэй названым вершы “Жнівень” А. Рудака ёсць такія радкі:

гэты дом існуе пакуль я яго бачу наяве
а калі засынаю насамрэч зьнікае ў цемры [5].
У Віталя Рыжкова ў лірычным творы “Снег” чытаем:
Падаюць з неба радкі,
якія нельга сказаць... [6].

Імкненне да вырашэння згаданых праблем не замыкаецца на ўласнай асобе. Магчыма таму, што паэт прызначаны “вучыць анёлаў і самагубцаў любіць жыццё” (В. Трэнас) [4, с. 71]. Але памятаючы пра натуральную дамінацыю асобаснага пачатку ў паэзіі, экзістэнцыйнае светаадчуванне не дае заставацца творцу спакойным. Напрыклад, у фразе “пакіньце іншым свае трамваі – // а мне – далёка, а я – бясконца” [7] з верша “Электрычка ў вырай” А. Рудака адчуваюцца ноткі агрэсіі і жаданне быць вышэй усіх умоўнасцей. Падобны тэзіс абыгрываецца і ў “Баладзе непадзельнага” В. Рыжкова, аднак з перавагай матыву пакорлівасці лёсу: “мы з табой пасярод зімы // мы з табою ахвяры умоў” [8]. С. Калядка робіць вывад, што “праблема экзістэнцыі ўзнімаецца ў творах беларускіх паэтаў не пад уздзеяннем моды на пэўныя філасофскія вучэнні, а пад уплывам унутраных позываў ці сацыяльнай практыкі асобы” [2, с. 243].

Экзістэнцыйная заклапочанасць (сабой, сваімі блізкімі людзьмі, сваёй краінай, светам) вымагае ад паэта стойкасці. Калі пастаянна надта сур’ёзна адносіцца да ўсіх праблемаў, раней ці пазней эмацыйнае напружанне выбухне, прычым у самы нязручны момант. Таму нярэдка для таго, каб пераадолець такі няпросты стан, творцы сплятаюць праблемы экзістэнцыі і гумар. Найяскравейшы прыклад – урывак з верша “Дарожныя здарэнні” В. Рыжкова:

халодна і адзінока страшна
ніколі ня ведаеш што з табой здарыцца
ў наступны момант што цябе напаткае –
прыгажосьць
каханьне
лось [9].

Такім чынам, сучасныя маладыя аўтары шчыра імкнуцца да адкрытага выражэння актуальных праблем, робячы гэта ў манеры інтымнай спавядальнасці, што выглядае спробамі пошуку хоць якога годнага адказу на крык сусвету. Экзістэнцыйныя канфлікты ў лірычных тэкстах вырашаюцца шляхам эскапічных рэфлексійных роздумаў, выражэння адчуванняў сусветнай адзіноты, неспакою і заклапочанасці, сінтэзу гумару і сур’ёзнасці ідэй, суб’ектыўнасці ўспрыняцця рэчаіснасці, парадаксальнага сумяшчэння неабыякавасці да свету і раўнадушша да яго з прычыны панавання думкі аб бессэнсоўнасці жыцця.

**Спіс літаратуры**

1 Сартр, Ж. П. Экзістэнцыялізм – гэта гуманізм [Электронны рэсурс] / Ж. П. Сартр. – Рэжым доступу: http://www.rulit.net/books/ekzistencializm-eto-gumanizm-read-92045-1.html. – Дата доступу: 01.10.2014.

2 Калядка, С. У. Экзістэнцыяльныя праблемы ў беларускай паэзіі / С. У. Калядка // Міждысцыплінарныя даследаванні актуальных праблем тэорыі літаратуры / пад рэд. М. А. Тычыны. – Мінск:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Беларуская навука, 2011. – С. 200–244.
3 Анохін, К. Падчас сеансу пытанняў [Электронны рэсурс] / К. Анохін. – Рэжым доступу: http://litradio.by/index.php?newsid=745. – Дата доступу: 02.10.2014.
4 Трэнас, В. Цуд канфіскаванага дзяцінства: Вершы / В. Трэнас. – Мінск: Логвінаў, 2005. – 94 с.
5 Рудак, А. Жнівень [Электронны рэсурс] / А. Рудак. – Рэжым доступу: http://litradio.by/index.php?newsid=510. – Дата доступу: 02.10.2014.
6 Рыжкоў, В. Снег [Электронны рэсурс] / В. Рыжкоў. – Рэжым доступу: http://litradio.by/index.php?newsid=229. – Дата доступу: 02.10.2014.
7 Рудак, А. Электрычка ў вырай [Электронны рэсурс] / А. Рудак. – Рэжым доступу: http://vershy.ru/content/tramvai. – Дата доступу: 02.10.2014.
8 Рыжкоў, В. Балада непадзельнага [Электронны рэсурс] / В. Рыжкоў. – Рэжым доступу: http://vershy.ru/content/balada-nepadzelnaga. – Дата доступу: 02.10.2014.
9 Рыжкоў, В. Дарожныя здарэнні [Электронны рэсурс] / В. Рыжкоў. – Рэжым доступу: http://vershy.ru/content/darozhnyya-zdarenni. – Дата доступу: 02.10.2014.

УДК 82-2:808.1

Т. В. АВДОНИНА
(г. Гомель, ГГУ им. Ф. Скорины)

## ПРОБЛЕМА АВТОРА В КОНЦЕПЦИИ СОВРЕМЕННЫХ ДРАМАТИЧЕСКИХ ПРОИЗВЕДЕНИЙ

Одной из наиболее актуальных категорий эстетики является категория автора в литературном произведении. Существует грань между автором как лицом реально-биографическим и автором – носителем идейной концепции произведения, и в этом смысле автор рассматривается в качестве категории литературоведческого анализа. Безусловно, автор произведения связан с реальным автором, но “не тождествен ему, поскольку в художественном произведении воплощается не вся полнота личности автора, а лишь некоторые ее грани” [1]. Автор художественного произведения может отличаться от автора как реального человека: яркое романтическое произведение может написать человек по характеру и мироощущению угрюмый (например, А. С. Грин), а оптимист и жизнелюб, как, например, А. П. Чехов, из-за специфики подачи художественного материала может прослыть “певцом сумерек”, “пессимистом”, “холодной кровью”.

В данной работе при рассмотрении категории автора решено было абстрагироваться от биографических сведений реальных авторов, их высказываний вне художественных произведений и рассмотреть личность автора в том плане, в каком она проявилась в конкретном произведении, проанализировать концепцию авторского мировидения. Важно отметить, что автор прозаического произведения не равнозначен лирическому герою в поэзии.

С автором как реальным биографическим лицом и с автором как носителем концепции произведения не следует путать образ автора, в котором проявляется художественная условность. Образ автора как особая эстетическая категория возникает в литературе нечасто, когда внутри произведения создается образ творца данного произведения. Тогда образ автора рассматривается как специфический художественный прием, определяющий художественное своеобразие конкретного произведения (например, образ “самого себя” в “Евгении Онегине” А. С. Пушкина) [1].

Одним из компонентов содержания наряду с тематикой (область отражения реальности) и проблематикой (область постановки вопросов) является “идейный мир” (область художественных решений) [1] произведения, включающий в себя собственно идею произведения, а также систему авторских оценок, авторский идеал и модус художественности (пафос) произведения. Идейный мир “завершает” архитектонику художественного содержания, прояс-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ